УДК 373.2

**Рачкоўская Таццяна Уладзіміраўна**
*Дзяржаўная установа адукацыі «Мірскі яслі-сад», аг. Мір, Рэспубліка Беларусь, mir-sad@bar-roo-edu.brest.by*

# ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ БЕЛАРСКАЙ МОВЫ ПРАЗ РОЗНЫЯ ВІДЫ ДЗЕЙНАСЦІ

Развіццё асобы дзіцяці ў грамадстве немагчыма без ведання роднай мовы. Дашкольны ўзрост з'яўляецца найбольш спрыяльным перыядам для авалодання дзецьмі беларускай мовай. Менавіта ў гэты прамежак яго жыцця ў дзіцяці фарміруецца цікавасць, патрэба да ведання роднай мовы. Аўтар звяртае ўвагу на заняпад беларускай мовы ў сучасных рэаліях і ў сваёй рабоце падымае пытанне папулярызацыі беларускай мовы праз рэгламентаваную і розныя віды нерэгламентаванай дзейнасці дзяцей, праз работу з бацькамі, стварэнне навакольнага асяроддзя.
**Ключавыя словы:** дашкольнік; развіццё мовы, беларуская мова.

**Rachkovskaya Tatiana Vladimirovna**
*Mirsky Nursery-kindergarten, Mir, the Republic of Belarus, mir-sad@bar-roo-edu.brest.by*

# POPULARIZATION OF THE BELARUSSIAN LANGUAGE THROUGH VARIOUS ACTIVITIES

The development of a child's personality in society is impossible without knowledge of the native language. Preschool age is the most favorable period for children to learn the Belarusian language. During this period of life the child develops an interest, a need for knowledge for his native language. The author pays attention to the decline of the Belarusian language in modern realities and raises the issue of popularization of the Belarusian language through regulated and various types of unregulated children activities, through working with parents, creating an environment in his work.
**Kee words:** preschooler; language development; the belarusian language.

**Уводзіны.** Усім вядома, што дашкольны ўзрост з'яўляецца самым спрыяльным перыядам для актыўнага маўленчага развіцця чалавека. Менавіта ў гэты час адбываецца фарміраванне вуснай мовы і навыкаў маўленчых зносін — асновы для станаўлення дзіцяці як асобы.

У сувязі з гэтым узрастае роля ўстановы дашкольнай адукацыі, на якую ўскладваецца адказнасць не толькі за развіццё камунікатыўных навыкаў у дзіцяці, але за фарміраванне сродкамі роднай мовы нацыянальнай самасвядомасці, за перадачу літаратурнай спадчыны, культурных традыцый, назапашаных беларускім народам на працягу гісторыі свайго існавання. Задача ўскладняецца тым, што многія дзеці, а нават і бацькі не толькі не ўмеюць размаўляць па-беларуску, але не разумеюць мовы. Такім чынам, перад намі акрэслілася праблема павышэння статуса беларускай мовы, развіццё не толькі мовы дзяцей, але і зацікаўленасці бацькоў [1, с. 3].

**Асноўная частка.** Дашкольнікі, засвойваючы родную мову, авалодваюць такой формай маўленчых зносін, як вуснае маўленне. Таму дзіця неабходна вучыць слухаць і разумець маўленне, звернутае да яго, падтрымліваць размову, адказваць на пытанні, задаваць пытанні самому. Звязнае маўленне з'яўляецца сродкам паспяховага авалодання мовай: лексічнай, граматычнай, гукавой сістэмай.

Родная мова, якой авалодваюць дзеці ў зносінах з дарослымі, з'яўляецца галоўным сродкам засваення імі культуры свайго народа, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. У родным слове, па сцвярджэнні вялікага рускага педагога К. Д. Ушынскага, народ клапатліва захоўвае «ўвесь след свайго духоўнага жыцця».

Перад намі паўстала задача выявіць фактары, якія ўплываюць на зацікаўленасць дзіцяці размаўляць на роднай мове. Перш за ўсё работа была накіравана на арганізацыю групавога пакоя, папаўненне развіваючага асяроддзя. У групе быў аформлены куток беларускай культуры, у якім размешчаны посуд, гліняныя і ільняныя цацкі, альбомы, якія адлюстроўваюць мінулае і сучаснае нашай краіны; лялькі ў нацыянальнай вопратцы; дэманстрацыйна-наглядны матэрыял «Мой пасёлак», «Жывёлы Белавежскай пушчы» і г. д.; картатэкі з загадкамі, лічылкамі, рухомымі гульнямі, фізкультхвілікамі; дыдактычныя гульні «Вытокі», «Жывёлы беларускіх лясоў», «Беларуская нацыянальныя стравы», «Назаві па-беларуску», «Садавіна, агародніна», «Адгадай казачнага героя па апісанні» і інш.; макет карты Беларусі; альбомы «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», «Мая Радзіма Беларусь»; партрэты беларускіх пісьменнікаў і паэтаў; аўдыязапісы беларускіх песен, казак.

У групе абсталявалі кніжныя куткі, у якіх знаходзяцца зборнікі беларускіх казак, вершаў, альбомаў з малюнкамі прыгожых мясцін Беларусі, хрэстаматыя для дашкольнікаў «Залатая скарбонка».

Наступным напрамкам нашай працы з'яўляецца выкарыстанне беларускай мовы ў паўсядзённым жыцці. У сваёй практыцы мы прытрымліваемся такога правіла, што неабходна выкарыстоўваць беларускія словы і выразы ва ўсіх жыццёвых сітуацыях.

© Рачкоўская Т. У., 2022



Рэпазіторый БарДУ

Навучанне роднай мове на занятках — планамерны, мэтанакіраваны працэс развіцця пазнавальных здольнасцей дзяцей, засваення імі сістэмы элементарных ведаў аб наваколлі і адпаведнага слоўніка, фарміраванне маўленчых уменняў і навыкаў. Вылучаюцца заняткі па азнаямленні з навакольным светам, мастацкай літаратурай і заняткі па развіцці маўлення. На занятках па развіцці звязнага маўлення выкарыстоўваем дапаможнікі Н. С. Старжынскай і Д. М. Дубінінай «Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў».

Для правядзення больш паўнацэннай слоўнікавай работы намі распрацаваны сшытак «Размаўляй са мной па-беларуску». Ідэя стварэння дыдактычнага сшытка ўзнікла пры падрыхтоўцы і правядзенні спецыяльна арганізаванай дзейнасці па адукацыйнай вобласці «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін».

Мы распрацавалі і раздрукавалі дыдактычныя сшыткі па колькасці дзяцей. У працэсе вывучэння новых тэм, гульняў, жыццёвых сітуацый узнікае неабходнасць тлумачыць новыя словы. Слова тлумачыцца, а малюнак размяшчаецца ў сшытку і замацоўваецца ў памяці дзяцей. Выкарыстоўваем сшыткі падчас правядзення арганізаваных і неарганізаваных відаў дзейнасці: гульні «Перакладчык», «Назаві пяць слоў па-беларуску», «Апішы малюнак», «Назаві ласкава», «Складзі сказ». Пры жаданні дзеці могуць браць сшыткі дадому, каб замацаваць словы разам з бацькамі, навучыць бацькоў новым словам ці нават дапоўніць новымі словамі, якімі потым падзеляцца з дзецьмі групы.

Дзейсным сродкам для развіцця мовы дзяцей з'яўляецца творчая тэатралізаваная дзейнасць. Тэатралізаваная дзейнасць — адзін з самых эфектыўных спосабаў уздзеяння на дзяцей, у якім найболей ярка выяўляецца прынцып навучання — вучыць гуляючы. Кнігі, казкі, спектаклі з'яўляюцца для дзіцяці невычэрпнай крыніцай развіцця пачуццяў і фантазіі, у сваю чаргу, развіццё пачуццяў і фантазіі далучае яго да духоўнага багацця, назапашанага чалавецтвам. Тэатралізаваная дзейнасць развівае маўленчую сферу дашкольнікаў, дапамагае развіццю камунікатыўных здольнасцяў, засваенню новых патрабаванняў і кіраўніцтву карэкцыі рыс дзяцей.

Выхаванне цікавасці і любові да мастацкага слова дасягаецца праз азнаямленне дзяцей з мастацкай літаратурай, развіццё ў іх уменняў слухаць і разумець літаратурныя творы, аналізаваць іх, узнаўляць (чытаць на памяць вершы, пераказваць казкі і апавяданні). Мастацкае слова, сродкі мастацкай выразнасці (метафары, параўнанні, прымаўкі і г. д.) павінны стаць здабыткам дзіцяці, якім яно будзе карыстацца ў штодзённым жыцці.

Вялікая ўвага надаецца беларускаму фальклору. Калыханкі, забаўлянкі, прымаўкі, песні, казкі — вось тыя дасканалыя мастацкія формы фальклору, з дапамогай якіх мы знаёмім дзяцей з багаццем і разнастайнасцю навакольнага свету.

Цікавымі для выхаванцаў з'яўляюцца беларускія рухомыя гульні, як народныя, так і сучасныя (напрыклад, «Адгадай, чый галасок?», «Хто схаваўся?» і інш. Яны суправаджаюцца словам, і гэта далучае выхаванцаў да багацця беларускай мовы, узбагачае слоўнік, садзейнічае развіццю міжвольнай увагі, памяці. Іх мы ўключаем пры правядзенні заняткаў і ў свабоднай дзейнасці дзяцей, а таксама на прагулках. Падчас рухомых гульняў мы выкарыстоўваем беларускамоўныя лічылкі, якія садзейнічаюць развіццю памяці і выразнага маўлення дзяцей [2, с. 12].

Для паступовага ўвядзення беларускай мовы ў розныя віды дзейнасці дзяцей дашкольнага ўзросту выкарыстоўваем лялек-беларусаў: дзяўчынку Паўлінку і хлопчыка Янку. Яны паасобку або разам прыходзяць да дзяцей, цікавяцца іх заняткамі, гульнямі, размаўляючы толькі па-беларуску: задаюць пытанні, называюць асобныя прадметы, што знаходзяцца ў дзяцей, выконваюць розныя дзеянні з імі, расказваюць нескладаныя гісторыі. Такім шляхам наладжваюцца сітуацыйна-дзелавыя зносіны на беларускай мове.

Выхаваўчую накіраванасць маюць беларускія народныя песні, якія мы выкарыстоўваем як на занятках, так і ў нерэгламентаванай дзейнасці, пад час правядзення свят. Праз іх тэксты, лексіку дзеці ўзбагачаюць уяўленні аб наваколлі, прыродных з'явах, знаёмяцца з прыладамі працы, беларускімі назвамі месяцаў, дзён тыдня, нацыянальнымі стравамі, значна пашыраецца актыўны слоўнік.

Асаблівую ўвагу ў сваёй рабоце з дзецьмі выхавацелі надаюць дыдактычным, настольным, развіваючым гульням. Дыдактычная гульня абапіраецца на веды, якімі дзеці ўжо валодаюць, важна, што часта дашкольнікі ў адной гульні могуць выкарыстоўваць веды, атрыманыя на занятках па розных прадметах, па розных раздзелах праграмы. Іх тэматыка разнастайная: «Назаві па-беларуску», «Хто жыве ў беларускім лесе?», «Садавіна, агародніна», «Апрані хлопчыка і дзяўчынку ў беларускі касцюм», «Купім мэблю для Янкі і Арынкі», «Хто жыве ў лесе», «Нацыянальныя стравы беларускай кухні», «Адгадай казачнага героя па апісанні», «Перакладчыкі» і інш. Асобную ролю па далучэнні дзяцей да беларускай мовы і культуры выконваюць лэпбукі [3, с. 111].

Вялікі выхаваўчы патэнцыял маюць народныя святы і абрады. Яны задавальняюць дапытлівасць дзяцей, іх эстэтычныя патрэбы, цягу рухаў, фарміруюць творчае мысленне, пабуджаюць да супрацоўніцтва, вучаць пазнаваць беларускую культуру. Поспех засваення мастацкіх твораў залежыць ад таго, наколькі яны зразумелыя дзецям і даюць магчымасць выконваць ролі адпаведных персанажаў, песень, суправаджаць спевы мімікай, рухамі. Калі для спеваў дзяцей малодшых груп найбольш даступным песенным матэрыялам з'яўляюцца калыханкі, забаўлянкі, невялікія песенькі, то асаблівае месца ў старшых дзяцей займаюць песні, карагоды, гульні, якія дзеці вучаць для народных свят і абрадаў. На працягу года ва ўстанове адукацыі праводзяцца такія народныя святы, як Багач, Каляды, Масленка, Гуканне вясны, Купалле [2, с. 55].

Рэпазіторый БарДУ

Неабходна адзначыць, што на станаўленне маўлення дашкольнікаў як на беларускай, так і на рускай мове спрыяльна адбіваецца такое стаўленне бацькоў, пры якім яны падтрымліваюць засваенне дзецьмі дзвюх моў, выказваюць актыўную цікавасць да працэсу навучання, дапамагаюць дзіцяці ў засваенні як першай, так і другой мовы пры розных падыходах да навучання.

Такая пазіцыя бацькоў цалкам падтрымліваецца намі і педагогамі. Да свядомасці бацькоў даводзіцца інфармацыя, што білінгвізм не толькі не замінае развіццю асобы дзіцяці, але і ўзбагачае яго новымі ведамі, пашырае яго кругагляд, спрые павышэнню яго цікавасці да культуры свайго народа, да культуры наогул, не дае развіцца пачуццю моўнага нігілізму, з'яўляецца сродкам выхавання патрыятызму і інтэрнацыяналізму, духоўнасці.

З гэтай мэтай з бацькамі рэгулярна праводзіцца работа, накіраваная на знаёмства бацькоў з беларускімі часопісамі для дзяцей «Буся», «Вясёлка», «Чытанка-маляванка», наяўнасцю кніг розных жанраў на беларускай мове, з дзіцячымі беларускамоўнымі сайтамі, мультфільмамі, дзіцячымі песнямі.

З мэтай абуджэння ў бацькоў любові і павагі да сваёй краіны, роднай мовы, традыцый, народнай спадчыны, жадання фарміраваць усё гэта і ў сваіх дзяцей праводзяцца кансультацыі «Беларускі фальклор у выхаванні дзяцей беларуску разам!».

**Заключэнне.** Развіццё асобы дзіцяці ў грамадстве немагчыма без ведання роднай мовы. Дашкольны ўзрост з'яўляецца найбольш спрыяльным перыядам для авалодання дзецьмі беларускай мовай. Менавіта ў гэты прамежак яго жыцця ў дзіцяці фарміруецца цікавасць, патрэба да ведаў, якія адпавядаюць яго прыродным і індывідуальным задаткам, закладваецца трывалы фундамент ведаў роднай мовы.

Далучаючы дзяцей да святыняў свайго народа — роднай мовы, мы будзем садзейнічаць не толькі яе абагачэнню, але і развіццю пазнавальных і інтэлектуальных магчымасцей дзяцей, пазнанню беларускай культуры.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Старжынская, Н. С.* Беларуская мова ў дзіцячым садзе / Н. С. Старжынская. — Мінск : Нар. асвета, 1995. — 159 с.

2. *Старжынская, Н. С.* Развіццё беларускага маўлення дашкольнікаў : дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкол. адукацыі / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. — Мазыр : Белы Вецер, 2008. — 112, [4] с.

3. *Старжынская, Н. С.* Методыка развіцця роднай мовы : вучэб. дапам. / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. — 2-е выд., выпр. — Мінск : Выш. шк., 2008. — 301 с.

УДК 373.2.091.33-027.22]:80

**Савчин Александр Михайлович**
*Переяслав-Хмельницкий государственный педагогический университет имени Григория Сковороды, Переяслав-Хмельницкий, Украина, sam111@ukr.net*

## ФОРМИРОВАНИЕ У ДЕТЕЙ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА УСТОЙЧИВЫХ УМЕНИЙ СОЗДАВАТЬ РАССКАЗЫ ВСЕХ ТИПОВ В ИГРОВОЙ ФОРМЕ

Статья заостряет внимание заинтересованной аудитории на дефиците действенных педагогических технологий по формированию у детей старшего дошкольного возраста умений создавать рассказы всесторонней типизации в игровой форме, что значительно снижает эффективную подготовку детей к школе, коммуницирование маленькой личности с социумом. Вниманию заинтересованной аудитории предлагается к рассмотрению авторская педагогическо-мотивационная технология формирования у детей старшего дошкольного возраста устойчивых умений создавать рассказы всех типов в игровой форме.

**Ключевые слова:** авторская педагогически-мотивационная технология; фасилитационная среда; модератор; коучер; рассказ-презентация; рассказ-инструкция.

**Savchin Alexander Mikhailovich**
*Grigory Skovoroda Pereyaslav-Khmelnitsky State Pedagogical University, Pereyaslav-Khmelnitsky, Ukraine, sam111@ukr.net*

## FORMATION IN SENIOR PRESCHOOL AGE CHILDREN OF SUSTAINABLE ABILITY TO CREATE STORIES OF ALL TYPES IN A PLAY FORM

The article focuses the attention of the interested audience on the lack of effective pedagogical technologies for the formation in children of senior preschool age of the ability to create stories of comprehensive typing in a playful way, which significantly reduces the effective preparation of children for school, the communication of a small person with society. The attention of the interested audience is offered for consideration the author's pedagogical and motivational technology for the formation of stable skills in children of senior preschool age to create stories of all types in a playful way.

**Key words:** author's pedagogical-motivational technology; facilitation environment; moderator; coach; story-presentation; story-instruction.

© Савчин А. М., 2022



Репозиторий БарГУ